*Тэкст дыктанта*
*для правядзення ўступных іспытаў па беларускай мове*
*ва ўстанову адукацыі “Мінскі дзяржаўны абласны ліцэй” (10кл.)*

# Нікім не прызнаны

Стройны ясакар-прыгажун ціха драмаў на ўскраіне вёскі. Цёплым красавіцкім вечарам, удыхаючы на поўныя грудзі настоенае на пахах вясны паветра, адзін з вяскоўцаў гаварыў:”Хутка прыляцяць з выраю нашы буслы.”

Сапраўды, праз некалькі дзён да знаёмай буслянкі на ясакары вярнуліся гаспадары. Яны абудзілі ранішнюю цішыню радасным і гучным клёкатам.

Жыццё ў дружнай птушынай пары ішло спакойна, зладжана, як у гаспадарлівых людзей. Буслы ўладкавалі сваё жыллё, ад разнастайнай жыўнасці на лугах падужэлі. Колькі пяшчоты, даверу, цеплыні адчувалася ў іх узаемаадносінах! Невыпадкова і старыя, і малыя жыхары вёскі любілі разумных птушак.

І раптам нечаканасць: вяртаючыся аднойчы з палёту, наш знаёмы птах убачыў, што іншы бусел кружыцца над ясакарам, намерваючыся сесці. Напэўна, чужак быў слабы пасля доўгага палёту, таму не вытрымаў дружнага адпору пары, адступіў, але не пакінуў гэтага прыгожага кутка, усё лятаў і лятаў над прасторамі, не прызнаны нікім, адзінокі, без сяброў.

Той ціхі адвячорак і цяпер яшчэ ў памяці многіх. Людскую ўвагу нечакана прыкаваў бусел-незнаёмец: сабраўшы сілы, ён хутка набраў вышыню, зрабіў над гняздом круг, склаў крылы і з гучным клёкатам рынуўся ўніз.

168 слоў — Паводле А. Саснок